# РАЗДЗЕЛ VI
# БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

## ТЭМА 6.1. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Сучасная беларуская дзіцячая літаратура (на мяжы XX і XXI стст.) прадстаўлена разнастайнымі жанравымі формамі, шырокай тэматыка-праблемнай, вобразна-выяўленчай палітрай. Некаторыя са здабыткаў гэтай часткі сучаснага прыгожага пісьменства можна праілюстраваць наступнымі фактамі.

У другой палове 1980–2000-х гг. ствараліся такія літаратурныя формы, як азбукі (Р. Барадулін, А. Дзеружынскі, М. Танк і інш.), казкі з філасофскім зместам і прытчавай павучальнасцю (В. Шырко, В. Жуковіч, У. Васькоў і інш.), рымейкі народных казак (П. Васючэнка і С. Кавалёў, П. Місько і інш.), апавяданні (нарысы, эцюды) пра гістарычнае мінулае, свет прыроды, першыя жыццёвыя ўрокі для дзяцей (Э. Луканскі, Я. Пархута, С. Тарасаў, Я. Галубовіч і інш.), аповесці пра гістарычнае мінулае, узаемаадносіны дзяцей і дарослых (К. Тарасаў, А. Федарэнка, А. Якімовіч і інш.). Прыметнай з'явай сучаснай беларускай кніжнай прасторы стала пашырэнне твораў, якія ўзнаўляюцца пры дапамозе электронных носьбітаў інфармацыі і сеткі Інтэрнэт.

Беларуская дзіцячая літаратура ў канцы XX – пачатку XXI стст. імкнецца да асэнсавання новай рэчаіснасці, новай сістэмы маральна-этычных каштоўнасцей, шукае новыя шляхі абуджэння цікавасці да яе з боку чытачоў. Пошук но-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

вых тэм і форм іх прэзентацыі забяспечвае разнастайнасць і шматграннасць узораў сучаснага слоўнага мастацтва для дзяцей. У той жа час беларуская дзіцячая літаратура ў канцы XX ст. перажыла працэс пераасэнсавання ўласных традыцый і пошуку новага. Таму казаць пра дамінантныя тэндэнцыі яе развіцця можна толькі ўмоўна.

Проза. Сучасная проза для дзяцей імкнецца максімальна задаволіць патрабаванні чытачоў. Пра гэта сведчыць той факт, што актыўна ствараюцца адносна новыя для беларускай літаратуры паводле формы і зместу творы (комікс, фэнтэзі, навуковая фантастыка і інш.).

Коміксы пэўны час былі не вельмі папулярнымі, бо лічылася, што гэта прадукт, чужы для нашага грамадства. Аднак у 1990-х гг. быў выпушчаны шэраг беларускамоўных коміксаў, што мелі літаратурны падмурак. Да іх ліку адносяцца, напрыклад, "Дзікае паляванне" (1991) А. Глобуса і Ул. Сцяпана – яго можна лічыць першым паўнавартасным беларускім коміксам, "Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка" (1993) Ул. Ліпскага і І. Ліпскага і іншыя. Годам пазней выйшаў зборнік фантастычных коміксаў пад агульнай назвай "Дзе жылі бурсонікі", у які, акрамя аднайменнага комікса (тэкст У. Цвяткова, малюнкі К. Гардзеева), увайшоў яшчэ і "Планета Мілітар" (тэкст і малюнкі А. Каршакевіча). "Дзе жылі бурсонікі" – фантастычны аповед пра дзіўных істот з далёкага астэроіда – наіўных бурсонікаў, якія ўсё ўспрымаюць літаральна. Калі астранаўт Лявон Рыгоравіч, не вытрымаўшы перашкод у час рамонту зоркалёту, загадаў ім знікнуць, яны насамрэч пачалі знікаць, а разам з імі – усё навокал. У. Цвяткоў выбірае дастаткова арыгінальную форму аповеду для комікса: казачны аповед у аповедзе. Твор вучыць дзяцей быць больш цярплівымі і ўважлівымі да іншых. Комікс "Планета Мілітар" прысвечаны актуальнай антываеннай праблеме: вайна і цяжкасці яе наступстваў. Людзі спрабуюць дамовіцца з жыхарамі ваяўнічай планеты Мілітар, якія не ўспрымаюць гуманістычных аргументаў і працягваюць знішчаць сабе падобных.

Некалькі цікавых праектаў было здзейснена ў 2013 г., сярод іх – выданне комікса "Пра Кастуся" паводле п'есы У. Ка-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

раткевіча, мастацкім афармленнем якога займаўся У. Дрындрожык, а таксама комікса "дзіцячая заМова" Г. Лабадзенкі, у якім на 112 вясёлых малюнках хлопчык і дзяўчынка высвятляюць асаблівасці беларускай мовы.

У сучаснай беларускай літаратурнай прасторы ёсць таксама вэб-коміксы, напрыклад, сямейны комікс-серыял "Прыгоды Супер-Піфа", якi *"раскажа пра тое, як засцерагчы сябе ў інтэрнэце, як абараніць сваю асабістую інфармацыю ад цікаўных вачэй, як зберагчы свае паролі, файлы, паштовыя скрыні ад нядобразычліўцаў, як засцерагчы «онлайн-фінансы» ад зламыснікаў і інш."*[1].

З канца XX ст. асаблівую папулярнасць набылі кніжкі-маляванкі, якія спрыяюць развіццю назіральнасці, фантазіі, мыслення, крэатыўных здольнасцей падрастаючага пакалення ("Як Васілёк выратаваў каралеўства: казка-размалёўка"; "Беларускія ўборы" (1994), "Ваяры Белай Русі. Першая малая энцыклапедыя-размалёўка" (2006, 2015) і інш.).

У развіцці сучаснай прозы для дзяцей назіраюцца некаторыя заканамернасці. Як і раней, пераважаюць творы, прысвечаныя важнейшым маральна-этычным і бытавым праблемам, складанасцям узаемаадносін паміж людзьмі. Выпрацоўцы лепшых маральных якасцей, любові да прыроды, дабрыні прысвечана, напрыклад, апавяданне "Год карася" (1988) Івана Навуменкі. Яно мае форму рэтраспекцый-успамінаў: дзеці выраслі, даўно раз'ехаліся па краіне, а Мікалай Іванавіч адзначае кожны год дзень карася, нібы па ўсходнім календары, паколькі яго маленькія дзеці некалі не далі засмажыць карася і выпусцілі таго ў вадаём. Маральна-этычная праблематыка ўзнімаецца і ў апавяданнях "Мікітаў сон", "Дагары нагамі", "Васількова бант" Лідзіі Арабей; у гэтых творах выяўляюцца адносіны людзей да прыроды, сяброўства паміж дзецьмі, асуджаюцца зазнайства і грубасць. У апавяданнях "Новае сяброўства", "Птушка Хірасімы", "Калібры" (усе 1989) Л. Арабей услаўляе дружбу дзяцей розных народаў і краін, выказвае спачуванне да абяздоленых і пакрыўджаных.

[1] http://comics.superpeif.com/index_by.html. Дата доступу : 26.08.2013.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Сучасныя праблемы пакалення *next*, захопленага віртуальным сяброўствам, адлюстроўваюцца ў аповесцях "Пастка на рыцара" (2002), "Усё цудоўна, або Урок бяспечнага кахання", "Алёшкава каханне, або Віртуальнае дрэва рэальнасці", "Першы боль, або Доказ закона прыгажосці" (усе 2010) Валерыя Гапеева, "Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца" (2007) Алеся Бадака, "Там, дзе самота і радасці..." (2010) Уладзіміра Саламахі.

Асаблівая ўвага з канца XX ст. у дзіцячай літаратуры надаецца праблеме патрыятычнага выхавання. Паняцце "Радзіма" ў сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей (у параўнанні з сярэдзінай XX ст.) паступова лакалізуецца: пісьменнікі шмат увагі надаюць выхаванню павагі да "малой" радзімы, да Бацькаўшчыны.

Дзейсным сродкам выхавання патрыятычных пачуццяў з'яўляецца знаёмства з гістарычным мінулым, таму значнае месца ў празаічных творах канца XX ст. займае гістарычная тэматыка, прычым у большай ступені аб'ектам адлюстравання становіцца далёкая гісторыя. Гэта звязана з актуалізацыяй патрыятычнага выхавання дзяцей і падлеткаў. Перад пісьменнікамі стаіць важнейшая задача: адкрыць дзецям багацце гісторыі, вытокі беларускай дзяржаўнасці, каб яны змаглі асэнсаваць тое, што адбываецца зараз, зазірнуць у будучыню з пазіцыі ўрокаў мінулага.

У гэты час Сяргей Тарасаў друкуе шэраг матэрыялаў на гістарычныя тэмы: замалёўкі пра найбольш значныя падзеі ў старажытнай Беларусі, яе выбітных асоб – Францыска Скарыну, Льва Сапегу, Канстанціна Астрожскага і іншых. Публікуюць легенды, паданні Уладзімір Арлоў, Кастусь Тарасаў, Анатоль Бензярук. На аснове гэтых матэрыялаў пазней імі былі напісаны цікавыя нарысы-падарожжы па гісторыі Беларусі. Нарысы "Беларусь. Гістарычнае падарожжа для дзяцей" (2000) Кастуся Тарасава, "Вялікія і славутыя людзі зямлі Беларусі" (2002) Уладзіміра Бутрамеева, апавяданні і абразкі са зборніка "Фрэскі" (2004) Сяргея Тарасава вучаць дзяцей захапляцца родным краем, прыгажосцю краявідаў, ганарыцца слаўнымі гістарычнымі падзеямі. Многія таямніцы мінуўшчыны Беларусі адкрывае серыя "Сем цудаў Беларусі" (напрыклад, кнігі нарысаў "Адвечны покліч Радзімы" (2004),

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

"Славутыя родам сваім" (2006) Анатоля Бутэвіча). Так, у апошняй з названых кніг расказваецца пра прадстаўнікоў радаводаў славутых беларускіх князёў, якія шмат зрабілі для Бацькаўшчыны, – Алелькавічаў, Астрожскіх, Гальшанскіх, Гаштольдаў, Хадкевічаў, Храптовічаў, Чартарыйскіх.

Кніга "Адкуль наш род" (1996) Уладзіміра Арлова ўяўляе сабой своеасаблівы падручнік па гісторыі Беларусі для навучэнцаў малодшага ўзросту.

Акрамя кніг, што расказваюць пра даўнюю гісторыю Беларусі, выдаюцца творы этнаграфічнага і краязнаўчага зместу: мастацка-краязнаўчыя эцюды "Зямля бацькоў нашых. Падарожжа па родным краі" (1988) Яраслава Пархуты, "Невялікія гісторыі для юных беларусаў" (2009) Анатоля Бензярука, абразкі і вершы "Сядзіба, або Хата з матчынай душою" (2002) Міколы Маляўкі і інш.

Адной з традыцыйных праблем у беларускай дзіцячай літаратуры з'яўляецца праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды. У другой палове 1980-х гг. з'яўляюцца цікавыя празаічныя прыродазнаўчыя творы, у якіх ставяцца актуальныя пытанні выхавання гуманістычных адносін да прыроды, а ў якасці адной з важнейшых задач адукацыі вызначаецца выхаванне экалагічнай культуры ("Насякомыя: шасціногія суседзі" (2005) Леаніда Чумакова, "Грыбы: вялікая таямніца прыроды" (2006) Ядвігі Шапаравай, "Сакрэты кветак для дарослых і дзетак" (2010) Паліны Грынчанка і Алены Црашковай). Творы, якія напісаны ў гэтым рэчышчы, умоўна можна падзяліць на дзве групы. Да першай адносяцца кнігі, у якіх пераважае пазнавальны кампанент, да другой – выхаваўчы.

Арыгінальнай кнігай, якая напоўнена пазнавальным і выхаваўчым эмацыйным кампанентам, з'яўляецца зборнік "Ад студзеня да студзеня: каляндар прыроды"[1] (2003) Янкі Галубовіча, што складаецца з дзвюх частак – "Каляндар прыроды"

[1] Звяртае на сябе ўвагу падзагаловак гэтай кнігі: "Каляндар прыроды". Пачатак своеасаблівай формы падачы прыродазнаўчага матэрыялу, вызначаны такім чынам, быў пакладзены яшчэ ў сярэдзіне XX ст.: у творчасці беларускага пісьменніка В. Вольскага ("Месяц за месяцам"), класіка рускай дзіцячай прыродазнаўчай літаратуры В. Біянкі ("Сінічкін каляндар", "Лясная газета").



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і “Апавяданні, абразкі”. Асноўная ідэя зборніка сфармулявана ва ўступным артыкуле “Любіць родную прыроду”: “<...> *і людзі, і звяры, і рыбы, і птушкі, і расліны — жывуць у адным доме, які называецца прыродай. Дык як жа нам не шанаваць, не берагчы свой родны дом?*”[1]. У першай частцы кнігі матэрыял падаецца ў форме нарысаў, якія прысвечаны асобным месяцам. Расказваючы пра характэрныя рысы той або іншай пары года, пісьменнік падае энцыклапедычныя звесткі пра звяроў, народныя прыметы, звязаныя з месяцамі года. Другі раздзел кнігі — “Ад студзеня да студзеня” — гэта кароткія апавяданні і абразкі прыродазнаўчага зместу.

Найважнейшыя праблемы выхавання экалагічнай культуры, развіцця экалагічнага мыслення закранаюцца ў апавяданнях “Госць з Чырвонай кнігі”, “Зорачка” (1997) Эдуарда Луканскага, “Навошта ружы калючкі” (1995) Даіра Слаўковіча, “Ратан” (1999) Андрэя Федарэнкі, “Вясёлыя скокі” (2003) Васіля Макарэвіча, “Лясная сімфонія”, “Пчолы і трутні” (2004) Васіля Гурскага і інш.

Адной з асаблівасцей сучаснай беларускай прозы для дзяцей з’яўляецца яе інтэлектуальная скіраванасць, акцэнтаванне ўвагі на самастойным набыцці ведаў. Цікавая у гэтых адносінах публікацыя ў “Вясёлцы” (1988) цыкла навукова-пазнавальных твораў “Урокі думкі” Васіля Віткі. Развіццю дапытлівасці ў дзяцей садзейнічаюць апавяданні са зборніка “Азбука агранома Валошкі” (1989) Змітрака Марозава, у якіх аўтар у папулярнай форме расказвае дзецям пра свет флоры, пра расліны, што растуць у агародзе і ў полі, пра вялікую працу па іх вырошчванні, пра карысць раслін для чалавека.

Пазнавальнасцю вызначаюцца і невялікія аповесці “Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля” (1985) Клаўдзіі Каліны, “Акадэмія... на колах, альбо За вясёлкай наўздагон” (1991) Міколы Чарняўскага.

У 1995 г. выйшла ў свет арыгінальная кніга Алеся Бадака “Маленькі чалавек у вялікім свеце”, у якой мастацкія творы (вершы, апавяданні) суправаджаюцца каментарыямі — гэта ў

[1] Галубовіч, Я. Ад студзеня да студзеня : каляндар прыроды / Я. Галубовіч. Мінск, 2003. С. 6.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сваю чаргу спрыяе разуменню дзецьмі складаных філасофскіх паняццяў. Акрамя таго, тут ёсць шэраг карысных метадычных парад для педагогаў.

На новы шлях развіцця ўзышла ў гэты час навукова-фантастычная і прыгодніцкая літаратура. Лепшыя традыцыі вострасюжэтных авантурных твораў працягвае Андрэй Федарэнка. Так, у яго аповесці "Афганская шкатулка" (2001) расказваецца пра прыгоды вясковых хлопчыкаў Ціма і Валіка, якія дапамаглі галоўнаму герою твора Барысу Крушынскаму – былому салдату-афганцу – вызваліцца з-пад арышту, высачыць злачынцаў. У творы адлюстраваны карэнныя змены ў жыцці цэнтральнага персанажа, які зведаў многае ў жыцці і змог дапамагчы трынаццацігадовай дзяўчынцы, адчуў, што такое клопат, што ў свеце ёсць яшчэ неабыякавыя да чужога гора людзі.

Сярод фантастычных і прыгодніцкіх твораў вылучаюцца аповесці празаіка і драматурга Аляксея Якімовіча. Яго творы разнастайныя паводле зместу і сэнсавай насычанасці: "Гордзіеў вузел" (1987) пра бытавыя прыгоды школьніка Алеся Пятрашкі, якога сябры і настаўнік імкнуцца пераканаць у важнасці вучэбнай дзейнасці, прыгодніцка-фантастычныя аповесці "Эльдарада просіць дапамогі" (1989), "Сакрэт Тунгускага метэарыта" (1993), аповесць-казка "Выпрабаванне, альбо Баба Яга на ўроку заалогіі" (1989), аповесць "Прыгоды шасцікласніка Максіма" (1993). У аповесці-казцы "Выпрабаванне, альбо Баба Яга на ўроку заалогіі" расказваецца пра прыгоды шасцікласнікаў вясковай малакамплектнай школы, якія трапляюць у свет беларускіх народных казак, што дае магчымасць дзецям паказаць свой характар, праявіць смеласць і знаходлівасць у барацьбе з Бабай Ягой, Цмокам, уменне прыйсці на дапамогу тым, каму яна патрэбна.

Арыгінальныя сюжэты выкарыстаны ў такіх фантастычных і фэнтэзійных творах, як "Пакланюся Перуну, памалюся Вялесу..." (2011) Алеся Наварыча, "Казімір – сын Ягайлы + Насця з 8 «Б»" = (каханне)" (2011) Раісы Баравіковай.

Працягваецца развіццё празаічнай літаратурнай казкі, асаблівасцямі якой з'яўляюцца сувязь з фальклорам і літаратурнымі традыцыямі (на ўзроўні пераймання вобразнай сіс-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тэмы, стылю, сюжэтных калізій), скіраванасць на мастацкі і выдавецкі эксперыменты. У гэтым напрамку працавалі Павел Місько ("Сама рабка, на галаве — чырвоная шапка"), Андрэй Федарэнка ("Мужыкі і пан") і інш. Даволі часта, запазычваючы фальклорныя сюжэты, пісьменнікі імкнуцца наблізіць іх да разумення сучасных дзяцей. Пры гэтым нярэдка выкарыстоўваюцца адаптацыя, апрацоўка народных казак, легенд, паданняў ("Заклятыя скарбы" (1992) ва ўкладанні Уладзіміра Ягоўдзіка, "Белавежскія быліцы і небыліцы" (1996) Міколы Гайдука, "У ноч на Івана Купалу" (2005) ва ўкладанні і апрацоўцы Антона Гурскага), прыём стылізацыі ("Пра майстра Дзве Залачоныя Дужкі" Раісы Баравіковай, "Залатое Сэрца" Ніны Мацяш), пародыі на літаратурную казку ("Выпрабаванне, альбо Баба Яга на ўроку заалогіі" Аляксея Якімовіча).

Пісьменнікі імкнуцца ў сваіх казках "актуалізаваць" іх мастацкі свет за кошт апісання сучаснага горада, падкрэсленай увагі да дэталяў (напрыклад, галоўны герой казачнай аповесці "Дахавік Казік" (2011) У. Васькова чытае часопісы "Ідэі вашага дома", "Прыгожыя дамы", падарожнічае разам з сябрамі ў Еўропу без візы, "*як кантрабандыст*"), за кошт выкарыстання сучаснага слэнгу (напрыклад, у казцы "Пацучок Фэлік падарожнічае" (2013) А. Масла тлумачыцца, што "*«ДзяржСТРАХ» для людзей тое самае, што «Супрацькатэ» для пацучынай радзіны*"[1], сам "*круты спецыяліст*" Фэлік з кампаніяй прыязджае на шопінг, потым наладжвае салют у інтэрнэт-кавярні, разам з "*выбітнымі тусоўшчыцамі, загартаванымі дыскатэкамі*", Ларыскай і Анфіскай, раз'язджае па горадзе на джыпе).

Такія асучасненыя казкі дастаткова часта выходзяць у серыі "Казкі XXI стагоддзя".

Узорам беларускай мюнхаўзіяды з'яўляюцца напісаныя Васілём Шырко цыклы казак "Дзед Манюкін не салжэ" (1991), "Дзед Манюкін і ўнукі" (2003). У цэнтры ўвагі тут стары, аповеды якога пра мінулыя часы, пра дзіўныя гісторыі, якія нібыта здарыліся з ім самім, дужа падабаюцца дзецям, але не ўспрымаюцца сур'ёзна дарослымі, бо носяць відавочна фан-

[1] Масла, А.С. Пацучок Фэлік падарожнічае : казка / А.С. Масла. Мінск, 2013. С. 5.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тастычны характар або ўтрымліваюць элементы гіпербалізацыі. Асаблівасцю гэтага цыкла з'яўляюцца разважанні пра жыццё, якія маюць філасафічны змест, а таксама прытчавую павучальнасць. Па сваёй сэнсавай насычанасці казкі В. Шырко набліжаюцца да філасофскай прозы.

Адной з асаблівасцей сучасных беларускіх літаратурных казак з'яўляецца іх пазнавальная скіраванасць. Пісьменнікі імкнуцца, каб казка не толькі выхоўвала, але і вучыла, знаёмячы, напрыклад, з правіламі руху ("Чарадзейная іскра: казкі аб правілах руху" (1986) Рыгора Аўраменкі), магчымасцямі інтэрнэту і здольнасцямі камп'ютараў ("Як акіян з кропелькай барукаўся" (2003) Анатоля Бутэвіча, "Падказкі ў казках доктара Компі" (2008) Вольгі Шчукінай, "Прыгоды Віруса Шкодзі" (2009) Анатоля Бутэвіча), з літарамі ("Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка" (1993) Уладзіміра Ліпскага), жыццём вадаёма ("Каляровая затока" (2008) Пятра Васючэнкі) і інш. Падобнага роду мастацка-пазнавальныя казкі максімальна набліжаюць навуковыя веды да дзіцячага разумення, садзейнічаюць сацыялізацыі дзяцей, бо звязваюць тэарэтычныя веды з практыкай, рэалізуючы такім чынам адзін з асноўных прынцыпаў дыдактыкі.

Папулярнасцю карыстаюцца аповесць-казка, якая сумяшчае ў сабе адзнакі прыгодніцкага твора ("Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка" (1993) А. Савіцкага), фэнтэзі ("Дзве аповесці пра міжпланетнага Пажарніка" (1996) Р. Баравіковай) і інш. У апошнім з названых твораў міжпланетны Пажарнік з Мамурыі праз падарожжа на Зямлю выконвае своеасаблівы абрад ініцыяцыі (далучэння), праверкі на даросласць. Разам з тым, ён, як і рыцары сярэднявечных раманаў, быццам разгадвае свой квэст, звяраючы закладзеную ў ім сістэму маральных каардынат з той, якая існуе ў паралельным свеце. Мамурык – дзейсны герой, які, нягледзячы на свой падкрэслена невялікі памер, здольны ўступіць у барацьбу з абсалютным Злом, увасобленым у смертаносным рэчыве – праткніце. Пры гэтым міжпланетны Пажарнік застаецца адзінокім героем, нягледзячы на тое, што яго "іншасць" не перашкаджае лёгка ўступаць у кантакты з рознымі істотамі, але чытач так і не заўважае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ніводнага сапраўднага сябра гэтага іншапланецяніна, нават Бамбарыза яго не адразу пазнала, калі апынулася на Мамурыі.

Сярод праблем развіцця беларускай прозы для дзяцей трэба назваць наступныя: агульная тэндэнцыя падзення цікавасці да чытання, недахоп арыгінальных твораў, пераважная схільнасць пісьменнікаў да напісання твораў забаўляльнага і энцыклапедычнага зместу, у якіх пакідаецца па-за ўвагай эмацыйная сфера жыцця чалавека. Новы час дыктуе свае "правілы гульні" і для мастацкай літаратуры, але пры гэтым варта памятаць пра важную ролю прыгожага пісьменства ў вырашэнні адукацыйна-выхаваўчых задач.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Драматургія. Драматургічнае мастацтва для дзяцей на сучасным этапе вызначаецца тымі тэндэнцыямі, якія характарызуюць развіццё драматургіі наогул: імкненне да эксперыментаў са зместам і формай, выкарыстанне тэхналогій гіпер- і інтэртэкстуальнасці. Прыкладам гэтага з'яўляюцца п'есы "Хохлік" (1992), "Пілiпка і Ведзьма" (1993) Сяргея Кавалёва, "Янук, рыцар Мятлушкі" (1995) Людмілы Рублеўскай, "Новы калабок" (1999) Пятра Васючэнкі і інш., у якіх творча асэнсоўваюцца фальклорныя сюжэты, матывы і вобразы.

У п'есе "Новы калабок" П. Васючэнкі творча выкарыстаны вобраз традыцыйна вясёлага героя казкі пра жывёл – калабка. Істотна змяніўшы сэнсавы аспект гэтага вобраза, аўтар канцэнтруе ўвагу дзяцей на ўсведамленні, што такое жывая істота, што ёсць сусветная любоў[1]. Сюжэт твора грунтуецца вакол пошукаў адказу на пытанне: "Што знаходзіцца ў Калабку?". Праз неадпаведнасць таго, што чакаецца і што атрымліваецца, дасягаецца эфект абсурднасці. Свой сакрэт Калабок адкрывае ў фінале твора: "*(Усе) (абступаюць Калабка). Ну, дык што ў цябе ўнутры?* <...> *(Калабок) Што ў мяне ўнутры? Душа ў мяне ўнутры, вось што! Яна ў мяне такая мяккая, трапяткая...*

---

палёт", 1988), М. Танка (зб. "Сярод лясоў наднёманскіх", 1987), М. Чарняўскага (зб. "Сеў аўторак у аўто...", 1997) і многіх іншых аўтараў.

[1] Тут адбываецца істотнае сэнсавае разыходжанне ў параўнанні з народнай казкай "Калабок", дзе мы знаёмімся з такой рысай характару, як хітрасць.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Я вас усіх так люблю! Дык, можа, і вы палюбіце мяне... хаця б трошкі?"*[1]. Калабок з душою ў сярэдзіне выглядае ў фінале твора наіўна і абсурдна, нягледзячы на лагічнасць і правільнасць яго учынкаў. Такім чынам адбываецца напаўненне казкі філасафічным зместам і элементамі псіхалагічнага аналізу матываў паводзін пэўных персанажаў.

Нешта падобнае назіраецца і з Хохлікам – адным з галоўных герояў аднайменнай п'есы С. Кавалёва. Хохлік у беларускім фальклоры – істота злая і страшная. У творы ж гэтага драматурга ён з'яўляецца занадта правільным у сваіх учынках, бачыць толькі добрае, імкнецца ўсім дапамагчы. Такая самаахвярнасць з'яўляецца алагічнай. У п'есе мастацкая прастора пабудавана па прынцыпе "свет наадварот": злая істота становіцца добрай, а Дзяўчынка, якая па сваёй прыродзе павінна быць добрай *a priori*, атаясамліваецца са злом.

Непрадказальная сітуацыя ствараецца і ў казцы Л. Рублеўскай "Янук, рыцар Мятлушкі". Тут сонечнае святло атаясамліваецца з бляскам залатога палаца злога Кадука, якога можна забіць толькі месячным промнем, што і робіць дачка Месяца – Мятлушка. У дадзеным выпадку маем справу з праблемай аўтарскай сімволікі, што разбурае стэрэатыпнасць чытацкага мыслення і прымушае дзяцей нанова паглядзець на гэты свет, у якім знешне добрае можа служыць злу. Казка з'яўляецца выразнай ілюстрацыяй яшчэ адной важнай тэндэнцыі развіцця драматургіі для дзяцей – выкарыстанне матываў рыцарскіх падарожжаў і прыгод, што можна назіраць і ў такіх творах, як "Філасофскі камень" (1994) У. Сіўчыкава, "Прыгоды Міхея і Марціна" У. Граўцова, "Маленькі збраяносец" (1999) П. Васючэнкі, "Драўляны рыцар" (1987) С. Кавалёва і інш.

Напрыклад, у п'есе С. Кавалёва, якая па сваёй сутнасці ўяўляе інтэртэкст, аўтар спалучае некалькі культурных слаёў у адным творы. Так, знешне сюжэт нагадвае традыцыйную чарадзейную казку з выкраданнем Яе (Дзяўчынкі), што спалучаецца з традыцыямі сярэднявечнага рыцарскага рамана. Тут Драўляны Рыцар павінен здзейсніць свой

[1] Васючэнка, П.В. Маленькі збраяносец : зб. п'ес для драм. і лял. тэатр. калектываў / П.В. Васючэнка. Мінск, 1999. С. 129.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асобы шлях (так званы "квэст") не столькі прасторавы, колькі душэўны, праверку на сумленнасць. Адначасова ў канву твора ўключаюцца міфы пра фей, міфалагічныя істоты Змору, Скныра, Здань, Цмока, Дамавічка. Часава-прасторавыя адносіны тут ускладнены. З аднаго боку, дзеянне адбываецца ў рэальным свеце, у старым драўляным доме на ўскрайку лесу, дзе некалі жылі звычайныя людзі са звычайнымі клопатамі. З другога боку, у п'есе мы бачым казачны свет, Каралеўства Сноў, дзе ёсць месца фантастычным персанажам і незвычайным учынкам. Такім чынам ствараецца эфект блізкасці падзей твора да рэальнасці, у якой жыве чытач, што дае яму магчымасць уключыцца ў прапанаваную аўтарам твора гульню. Вызначальным для гэтай казкі з'яўляецца тое, што галоўная задача станоўчага героя – не перамагчы адмоўных герояў праз іх фізічнае знішчэнне, а дапамагчы ім пераканацца ў ілжывасці ідэалаў, якім яны служаць. Гэта адзін з важнейшых прынцыпаў гуманістычнага выхавання, які захоўваецца ў сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей.

Неабходна заўважыць, што ў сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры назіраецца тэндэнцыя актуалізацыі фантастычных сюжэтаў ("Навагодні дэтэктыў" (1999) Пятра Васючэнкі); аўтары звяртаюцца да вострых праблем жыцця падлеткаў і юнакоў ("Рамантычнае падарожжа на той свет" (1994) Галіны Багданавай), уводзяць нехарактэрныя для дзіцячай літаратуры элементы трылера ("У чорным-чорным горадзе" (1990) Максіма Клімковіча і Міраслава Шайбака, "Звар'яцелы Альберт, альбо Прароцтвы шляхціца Завальні" (1994) Сяргея Кавалёва). Акрамя таго, драматургі выкарыстоўваюць модныя стратэгіі рымейку ("Новы калабок" (1999) П. Васючэнкі), абсурдызацыі рэчаіснасці ("Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага" (1990) П. Васючэнкі і С. Кавалёва, "Чарадзейныя суніцы" (1993) А. Якімовіча).

Матыў падарожжа і рыцарства – гэта своеасаблівы вынік адраджэнскай хвалі, якая паўплывала на беларускае мастацтва ў сярэдзіне 1990-х гг., павысіўшы цікавасць да гісторыі Беларусі, у тым ліку і сярэднявечнай. У сувязі з гэтым



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з'яўляецца вялікая колькасць твораў, прысвечаных адлюстраванню дзяржаўнай незалежнасці ў кантэксце відавочнай адсылкі да беларускай рэчаіснасці канца XX ст.

Так, напрыклад, у п'есе "Пра тое, як Янка Белую краіну ад Цмока вызваліў" (1993) В. Маслюка выкарыстаны традыцыйны фальклорны сюжэт пра асілка, які вызваляе людзей ад зла ў вобразе Цмока. Драматург спрабуе адлюстраваць розныя беларускія рэаліі, звяртаючы ўвагу, напрыклад, на характар людзей: *"(2 галава): Праклятыя людзі! Яны працуюць і дзень і ноч — і маўчаць. Іх б'юць бізунамі, але яны маўчаць, іх прымушаюць крычаць словы ў мой гонар — яны славяць мяне, але маўчаць іхнія вочы. Пракляты народ!"*[1]. У дадзеным выпадку можна правесці наступную паралель: вызваленне Белай краіны ад Цмока і набыццё Беларуссю незалежнасці. Больш за тое, у фінале твора падкрэсліваецца, што ў моцнай і квітнеючай вольнай Белай краіне яшчэ шмат ворагаў і абавязак кожнага з яе сыноў сцерагчы спакой у ёй.

Важнай праблемай, якая закранаецца ў сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей у кантэксце адпаведных мастацкіх вобразаў, з'яўляецца экалагічнае мысленне і выхаванне ("Кветкі пад ліўнем" (1993) Ігара Сідарука, "Каляровая затока" (1999) Пятра Васючэнкі, "Калі дракон прачнуўся" (1993) Міколы Арахоўскага і інш.). Галоўныя дзеючыя асобы п'есы І. Сідарука — кветкі, у цэнтры ж увагі казачнай драмы М. Арахоўскага — маленькае медзведзяня Букуз. Сучасныя драматургі з характэрнай для нашага часу прагматычнасцю адлюстроўваюць цяперашні жорсткі свет; напрыклад, у п'есе "Калі дракон прачнуўся" М. Арахоўскага паказваецца забойства чалавекам мядзведзіцы, маці Букуза, а таксама геданістычнае грамадства[2], жорсткі свет дарослых, якія забіваюць жывёл дзеля атрымання асалоды.

Важным элементам сучаснай драматургіі для дзяцей і юнацтва з'яўляецца выкарыстанне ў ёй элементаў фэнтэзі і навуковай фантастыкі. Менавіта ў такой стылістыцы вытры-

[1] Свецяць, свецяць зорачкі... : п'есы для лялечных тэатраў / уклад. С. Кавалёў. Мінск, 1993. С. 6.

[2] Такое грамадства грунтуецца на імкненні індывідуума максімалізаваць свой дабрабыт, задавальненні як вышэйшыя даброты і мэты жыцця.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маны п'есы "Канікулы на астэроідзе" (1994) Зінаіды Дудзюк, "Драўляны рыцар" Сяргея Кавалёва, "Рамантычнае падарожжа на той свет" Галіны Багданавай. У апошнім творы ўздымаецца актуальная для нашага грамадства праблема падлеткавага самазабойства.

У меншай колькасці ў сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей у параўнанні з папярэднім перыядам прадстаўлены п'есы рэалістычнага зместу з адпаведнай вобразнасцю ў іх. Рэалістычныя п'есы прысвячаюцца адлюстраванню побыту дзяцей, фарміраванню сістэмы маральна-этычных каштоўнасцей ("Рэпетыцыя" Андрэя Федарэнкі, "2 × 2 = ?" Пятра Васілеўскага). Часцей у гэтых творах фабулай "кіруе" не драматычнае дзеянне, а гульня ў сітуацыю. Тут галоўным з'яўляецца прынцып індэтэрмінаванасці, паводле якога адвяргаюцца ўсеагульная заканамернасць, прычынна-вынікова сувязь і залежнасць. Гутарка ў творы ператвараецца ў фабульнае дзеянне.

Так, фабульнае дзеянне п'есы "Рэпетыцыя" (1995) А. Федарэнкі будуецца па прынцыпе "тэатр у тэатры" вакол камунікатыўнай праблемы і праблемы тэатральнасці (якім павінен быць тэатр), што падкрэсліваецца ўжо ў загалоўку твора. У цэнтры ўвагі тут спробы школьнага тэатральнага гуртка дагадзіць настаўніку Рыгору Змітравічу, які патрабуе прадставіць на конкурс дзіцячых калектываў арыгінальную "сцэнку". У сувязі з гэтым у асноўную канву дзеяння ўплятаюцца розныя варыянты такіх "сцэнак", што значна пашырае мастацкую прастору "Рэпетыцыі". Спачатку ад дзяцей патрабуецца, каб гэта было "*нешта без цімураўцаў, без чырвоных гальштукаў, без ералашаўскіх школьных анекдоцікаў... Але разам з тым – каб было нешта сучаснае. Без псеўдафальклору, без living рознага сюсюкання, бабаў-ёгаў і кашчэяў*"[1] Гэтыя словы Рыгора Змітравіча з першага эпізоду гучаць абсурдна ў адносінах да яго ж слоў у апошнім (пасля прагляду банальнай "сцэнкі" змагання волата з цмокам па матывах народных казак): "*Цудоўна! Выдатна! Я і не сумняваўся, што ўсё ў нас атрымаецца! Гэта тое, што трэба! Быць нам на першым месцы! Упэўнены, што да такога больш ніхто не дадумаецца!..*"[2].

[1] Федарэнка, А. Рэпетыцыя / А. Федарэнка // Сінязорка : п'есы / уклад. Н. Загорская. Мінск, 1995. С. 160.

[2] Тамсама. С. 171.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Своеасаблівым запаветам усім драматургам і мастакам XXI ст., якія пішуць для дзяцей і дарослых, з'яўляюцца словы самазабойцы Бронюся з драмы Г. Багданавай "Рамантычнае падарожжа на той свет": *"Дзякуй Богу, што дваццаць першае стагоддзе абяцае быць гуманітарным, як і дзевятнаццатае. Можа, дасць Бог, крыві меней пральецца, чым у бяздушным дваццатым"*[1]. Спраўджванню такога спадзявання спрыяе сучасная беларуская драматургія для дзяцей, якая мае вялікі духоўны патэнцыял для выхавання маральна ўзвышанай асобы.

## Пытанні і заданні

*Проза*

1. Якія асноўныя жанрава-тэматычныя тэндэнцыі можна вылучыць у развіцці сучаснай беларускай прозы для дзяцей?

2. Якія тэмы і праблемы хвалююць сучасных дзіцячых пісьменнікаў?

3. Чым вызначаюцца сучасныя літаратурныя казкі?

4. Уявіце сабе, што вы складальнік чытанкі-хрэстаматыі для навучэнцаў малодшага ўзросту. Якія творы вы б уключылі ў сваё выданне? Напішыце прадмову да такой хрэстаматыі, патлумачыўшы выбар тых або іншых твораў.

*Паэзія*

5. Якія тэмы і праблемы хвалююць беларускую дзіцячую паэзію на сучасным этапе?

6. Адзначце асаблівасці раскрыцця тэмы "чалавек і прырода" ў сучаснай паэзіі для дзяцей.

7. Акрэсліце жанравую разнастайнасць лірыкі для дзяцей.

8. Напішыце літаратурны твор для дзяцей у адным з жанраў дзіцячай паэзіі: верш, загадка, забаўлянка, казка або інш. Патлумачце яго выхаваўчую, пазнавальную каштоўнасць. Укажыце, для якой узроставай групы ён падыходзіць. Дайце рэкамендацыі, на якіх занятках (мерапрыемствах) можа выкарыстоўвацца твор.

*Драматургія*

9. Якія праблемы грамадскага, псіхалагічнага, эстэтычнага зместу прадстаўлены ў сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей?

10. Назавіце драматургічныя казкі, у аснову якіх пакладзены матывы прыгодаў і падарожжаў.

11. Вылучыце асноўныя тэндэнцыі сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей.

---

[1] Багданава, Г. Рамантычнае падарожжа на той свет / Г. Багданава // Тэатральная Беларусь. 1994. № 6. С. 17

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

12. Якія асноўныя тэмы закранаюцца ў рэалістычных драматургічных творах для дзяцей?

13. Уявіце, што вы рэжысёр тэатра. Якую б сучасную п'есу для дзяцей вы паставілі? Чаму? Складзіце "рэжысёрскія рэмаркі" (пісьмовыя тлумачэнні па тэксце п'есы, дзе ў сціслай форме вызначаюцца настрой дзеючых асоб, інтанацыя рэплік, перамена пачуццяў, падтэкст і інш.) да аднаго акта выбранага вамі твора.

## Літаратура

### Асноўная

*Проза*

1. Галубовіч, Я. Ад студзеня да студзеня : каляндар прыроды / Я. Галубовіч. Мінск, 2003. С. 6.

2. Масла, А.С. Пацучок Фэлік падарожнічае : казка / А.С. Масла. Мінск, 2013. С. 5.

*Паэзія*

3. Барадулін, Р. Азбука – вясёлы вулей / Р. Барадулін ; маст. М.Р. Казлоў. Мінск, 1994.

4. Беларуская дзіцячая літаратура : хрэстаматыя : вучэб. дапаможнік / склад. : М.Б. Яфімава, М.В. Ляшук. Мінск, 1996.

5. Жуковіч, В. Гуканне вясны : вершы, казкі, загадкі / В. Жуковіч ; маст. А.І. Аблажэй. Мінск, 1992.

6. Жуковіч, В. Калядная вячэра / В. Жуковіч ; уклад. А.І. Сачанка // Пралеска : хрэстаматыя. Мінск, 1997.

7. Мазго, У. Завітала ў госці казка : казкі зблізку і здалёку / У. Мазго ; маст. У.І. Сытчанка. Мінск, 2014.

8. Маляўка, М. Крыжык / М. Маляўка // Вясёлка. 2004. № 12. С. 12.

9. Пазнякоў, М. Дарынка-весялінка : вершы, казкі, загадкі... / М. Пазнякоў ; маст. рэд. Ю.Ц. Цярэшчанка. Мінск, 1999.

10. Пазнякоў, М. Радзіма : вершы / М. Пазнякоў. Мінск, 2012.

*Драматургія*

11. Багданава, Г. Рамантычнае падарожжа на той свет / Г. Багданава // Тэатральная Беларусь. 1994. № 6. С. 17.

12. Васючэнка, П.В. Маленькі збраяносец : зб. п'ес для драм. і лял. тэатр. калектываў / П.В. Васючэнка. Мінск, 1999.

13. Маслюк, В. Пра тое, як Янка Белую краіну ад Цмока вызваліў / В. Маслюк // Свецяць, свецяць зорачкі... : п'есы для лялечных тэатраў / уклад. С. Кавалёў. Мінск, 1993. С. 6.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

14. Федарэнка, А. Рэпетыцыя / А. Федарэнка // Сінязорка : п'есы / уклад. Н. Загорская. Мінск, 1995.

**Дадатковая**

*Проза*

15. Алейнік, Л. Пясочны гадзіннік : літаратурна-крытычныя артыкулы, нарысы, рэцэнзіі, нататкі / Л. Алейнік. Мінск, 2010.

16. Караткевіч, В.І. Канцэпт «горад» у сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей (на прыкладзе казкі А. Масла «Пацучок Фэлік падарожнічае») / В.І. Караткевіч // Працы кафедры сучаснай беларускай мовы. Вып. 12 / пад рэд. А.Я. Міхневіча. Мінск, 2013. С. 52–55.

17. Макарэвіч, А.М. Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях : дапаможнік / А.М. Макарэвіч, В.І. Караткевіч ; пад агульн. рэд. А.М. Макарэвіча. Магілёў, 2014. С. 49–53.

18. Макарэвіч, А.М. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. 2013. № 8. С. 21–30.

19. Марціновіч, А. Святло чароўнага ліхтарыка. Выбраныя старонкі гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры : у 2 кн. / А. Марціновіч. Мінск, 1997–1998.

20. Хрэстаматыя для пазакласнага чытання ў 2 класе : дапаможнік / уклад. В.І. Гапанёнак. Мінск, 2016.

21. Хрэстаматыя для пазакласнага чытання ў 3–4 класах : дапаможнік / уклад. В.І. Гапанёнак. Мінск, 2016.

*Паэзія*

22. Алейнік, Л. Беларуская дзіцячая паэзія : учора і сёння / Л. Алейнік, А. Грыбоўскі // Полымя. 2009. № 2. С. 129–136.

23. Алейнік, Л. Сучасная беларуская літаратура для маленькіх чытачоў / Л. Алейнік // Полымя. 2012. № 3. С. 128–138.

24. Дыдактычны матэрыял па беларускай дзіцячай літаратуры : вучэб.-метад. дапаможнік / М.Ф. Шаўлоўская. 3-е выд. Мінск, 2007.

25. Марціновіч, А. Святло чароўнага ліхтарыка : выбран. старонкі гісторыі белар. дзіцячай літаратуры : дапаможнік. У 2 кн. Кн. 2 / А. Марціновіч. Мінск, 1998.

26. Мураў'ёва, Т. Таямніяае падарожжа ў свет дзяцінства / Т. Мураўёва // Полымя. 2009. № 2. С. 127–140.

27. Яфімава, М.Б. Слова краска, слова ззянне... : дапаможнік / М.Б. Яфімава. Мінск, 2000.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Драматургія*

28. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. Мінск, 2000.

29. Драбеня, Ф. Сучасная беларуская дзіцячая драматургія : сюжэты, матывы, вобразы / Ф. Драбеня // Полымя. 2008. № 11. С. 109–115.

30. Караткевіч, В.І. Спецыфіка вобразнай сістэмы драматургічных твораў Пятра Васючэнкі для дзяцей (на матэрыяле зборніка «Маленькі збраяносец») / В.І. Караткевіч // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-годдзя Кірылы Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі : матэрыялы XI Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–26 кастр. 2013 г. У 2 ч. Ч. 2 / пад рэд. Т.П. Казаковай. Мінск, 2013. С. 264–269.

31. Караткевіч, В.І. Фэнтэзі ў дзіцячым чытанні (некалькі заўваг да п'есы С. Кавалёва «Драўляны рыцар») / В.І. Караткевіч // Беларусь на скрыжаванні стагоддзяў: ад класікі да сучаснасці : матэрыялы Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 12 лістап. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. ; рэдкал. : В.Д. Старычонак [і інш.]; адк. рэд. В.Д. Старычонак. Мінск, 2012. С. 120–123.

32. Лаўшук, С.С. Гарызонты беларускай драматургіі / С.С. Лаўшук. Мінск, 2010.

33. Макарэвіч, А.М. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах / А.М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. 2013. № 7. С. 9–16.

34. Несцяровіч, В.Б. Драматургія для дзяцей : пошукі новага эстэтычнага зместу / В.Б. Несцяровіч // Пачатковая школа. 2009. № 5. С. 60–63.

35. Трафімчык, А.В. Беларуская дзіцячая драматургія / А.В. Трафімчык. Мінск, 2012.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова